**Козіч В.І. (Мінск)**

# Духоўны патэнцыял герояў прозы Максіма Багдановіча

Маральная прырода чалавека ў сваіх унутраных суб'ектыўных асновах амаль нязменная. Гэтак жа і колькасць добрых і злых людзей не змяняецца: ці стане хто сцвярджаць, што цяпер на свеце больш праведнікаў, чым было некалькі тысячагоддзяў таму. Бясспрэчна і тое, што высокія этычныя ідэі і ідэалы самі па сабе сталага паляпшэння ў жыцці і маральнай свядомасці не ствараюць. Разам з тым маральныя прынцыпы, культура паводзін, пачуццяў, ідэалы дабра і зла, справядлівасці і несправядлівасці фарміруюць духоўнасць асобы і грамадства ў цэлым. Зрэшты, уратаванне чалавецтва звязана найперш са зменамі ў духоўнай сферы.

Пазіцыя мастака слова ў паэзіі, прозе, крытыцы, публіцыстыцы – гэта імкненне зрабіць чалавека маральна больш моцным, навучыць яго думаць, пазбавіць ад богапакінутасці. Горкая праўда ў тым, што рэальнае чалавечае жыццё складаецца з комплексу няўмольных супрацьлегласцей – шчасця і гора, дабра і зла. Мала таго, няма ўпэўненасці, што дабро пераможа зло, радасць – боль, жыццё адвае вялікі тэрмін у смерці.

Ужо ў першым «нашаніўскім» апавяданні М. Багдановіча «Музыка» свет людзей падзелены на праведнікаў і «крыўдзіцелей народа», на бедных і багатых, на галодных і «сытых». Злыя, адпаведна Багдановічу-празаіку, як правіла, «сільныя». Менавіта яны кідаюць музыку ў турму, забіраюць скрыпку, пачынаюць самі іграць на ёй народу. «І ніхто не мог растлумачыць, чаму ад грання музыкі так моцна білася сэрца бедакоў. Ніхто не ведаў, што музыка ўсю душу клаў у ігру. Душа яго знала ўсе гора, што бачыў ён па людзях; гэта гора грала на скрыпцы, гэта яно вадзіла смыком па струнах; і ніводзін сыты не мог так граць, як грала народнае гора» [1, с. 7]. Атрымліваецца: бедныя, галодныя, у якіх «гневам вялікім блішчалі вочы» [1, с. 6], былі бяссільныя адстаяць сацыяльную справядлівасць, патлумачыць духоўны пафас грання музыкі. Зрэшты, сама скрыпка разбілася. Суцяшэнне ў тым, што аўтар пакідае надзею: «І з-памеж таго народу, катораму ён калісь граў, выйдуць дзесяткі новых музыкаў і граннем сваім будуць будзіць людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе…» [1, с. 7]. «Сонны» народ не ў стане абараніць праўду мастака зараз і сёння, а толькі ў часавай перспектыве.

У апавяданні востра паўстае матыў шчасця і няшчасця ў гармоніі музыкі з народам. Скрыпка пастаянна плача, у гранні гучыць жаласць і нуда, людзі льюць слёзы, у іх баляць сэрцы. «Крыўдзіцелі народу» толькі баяцца музыкі, але не жадаюць прыняць праўду творцы і перайсці на бок пакрыўджаных, паспрыяць іх шчасцю. Прасцей знішчыць музыку і доўжыць на зямлі зло. Малады празаік трымаецца жыццёвай ісціны і ў выніку дасягае мастацкай праўдзівасці.

Шчасце Савелія Валчкова, сацыяльна пакрыўджанага «маленькага» чалавека (апавяданне «Несчастный случай»), будзе дасягнута, калі пашэнціць без квітка трапіць на цягнік, знайсці на новым месцы хоць якую працу з самым мізэрным заробкам, перавезці ў горад жонку. Салодкая мара пра будучыню гучыць з вуснаў Савелія прымітыўна проста: «Ровная, однообразная, мирная жизнь его течет по-прежнему: ровно, однообразно, и хотя вяло и скучно, но

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тихо и безмятежно» [1, с. 12]. Але і гэтая мара героя не здзейсніцца, бо ён бессэнсоўна гіне пад коламі цягніка.

Вобразнае ўвасабленне **зла** ў апавяданні праходзіць як бы дзве прыступкі. Напачатку гэта начальнік станцыі, кандуктары, жандары, якія вымагаюць куплі білета. Валчкоў хоча пазбегнуць іх «нагло назойливых, зло насмехающихся приставаний» [1, с. 11]. Другая прыступка, калі Савелій пачынае думаць і да яго прыходзіць усведамленне-абвінавачванне, што ва ўсім вінаваты багатыя: «И думает он о том случайном счастье, каким пользуются другие, более привилегированные в жизни, – ну хоть бы те, разговор которых он только что слушал, – думал и о своем несчастье; и о том, что в природе и впрямь всего много везде и повсюду, но почему-то людям все тесно <…> так тесно, что ему, например, нет даже места в вагоне, как всем остальным, случайно более привилегированным людям, и едет он, крадучись, будто вор или убийца какой, – на крыше вагона – едет с боязнью, трепетом и риском своей жизнью» [1, с. 16]. Герой твора называе прывілеяваных багацеяў «бездушными, себялюбивыми, черствыми, холодными людьми». Толькі прырода ў М. Багдановіча надзелена станоўчымі чалавечымі якасцямі. Вецер пачуе «крик горя, крик сердца – как бы захотев узнать причину его, – метнется по белому свету – вихрем пронесется по широкой степи и, заглянув в бездумно открытые очи несчастного, с застывшим вопросом устремленные в небо, метнется в ужасе в сторону и ударит ураганом в величавый горделивый лес» [1, с. 18]. Лес не застанецца раўнадушным да смерці Савелія Валчкова, а «взмахнет своими мощными руками-ветвями, прошумит» [1, с. 19]. Вецер «загудит по широкой, раздольной степи». Маленькая былінка, а яна найбольш асацыіруецца з нябожчыкам, «застонет, задрожит и, припав безнадежно в отчаянии, своей хлипкой головкой к земле, долго-долго будет биться о ее холодную бесчувственную грудь…» [1, с. 19].

Маральнасць, справядлівасць, ісціна, гармонія жыцця мае ў М. Багдановіча цесную повязь з рэлігійнасцю, з вобразам Хрыста, які сімвалізуе валадарства Бога на зямлі. Апавяданне-замалёўка «Колька» распавядае пра смерць трохгадовага хлопчыка, якога ніхто не любіць, якому ніхто не спачувае. Смерць пасля прычасця на Вялікдзень адпаведна хрысціянскаму канону забяспечвае райскае жыццё на тым свеце. Для Колькі смерць – збавенне ад пакут, бо нават маці называе яго «надоедным», «болезным», жадае, каб сына «прибрал Господь». Смерць адкрывае магчымасці больш высокага жыцця за паміраннем – **вечнасць**: «Там, наверху, с распростертыми благославляющими руками стоит Тот, кого Колька видел на образе Воскресения в маленькой церкви, Кто шел к нему в сонме ангелов и Кто под видом яйца принес ему вечность» [1, с. 23].

«Нашаніўская» проза рухалася і жывілася патрыятычным пафасам служэння Бацькаўшчыне. На гэтым шляху вялікае значэнне набываюць такія каштоўнасці, як вера, справядлівасць і маральнасць таго, што робіцца ў імя высокіх прынцыпаў. Сентыментальнае апавяданне «Преступление» распавядае пра «злачынства» ў Інстытуце шляхетных дзяўчат, калі звальняюць выкладчыцу за тое, што яна мае пазашлюбную дачку. Маладая жанчына ідзе на станцыю і канчае жыццё самагубствам пад коламі цягніка. Педагагічнае начальства навучальнай установы гвалтоўна навязвае свае ўяўленні і разуменні пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

святасць і грэшнасць. Нараджэнне дзіцяці без мужа – парушэнне маральнага кодэксу тагачаснага грамадства. «Судорожные рыдания» дзяўчынкі Каці над «обезображенным трупом» маці, па сутнасці, перакрэсліваюць штучна створаную гармонію «благонамеренности и добродетельности» ў педагагічным калектыве, бо ніякімі высокімі прынцыпамі нельга апраўдаць слёзы сіраты.

Эпіцэнтрам у эстэтычнай канцэпцыі М. Багдановіча становіцца краса, якая забяспечвае дыялектыку жыццёвай і мастацкай праўды («Музыка», «Апокрыф», «Апавяданне аб іконніку і залатару», «Шаман», «Баян»). Не забываецца на красу М. Багдановіч і ў мініяцюры «Страшное», падзеі якой адбываюцца на вайне. Староннім вокам не ўдзельніка, а назіральніка схоплены на полі бою труп забітага «мечтателя», які «проста лежал на земле в удобной позе и смотрел прямо в небо, синевшее над его головой. А по небу тихо плыли облака, и, вероятно, так же тихо проплывали мысли в голове этого мечтательно лежащего человека» [1, с. 71]. Вайна ўносіць свае карэктывы ў філасофію красы: цяпер яна знітавана са страхам смерці. У мірным жыцці краса выклікае пазітыўныя настроі радасці, замілавання. Герой Сямёнаў звыкла, спакойна глядзіць на забітых «с оторванными, переломанными членами, вырванными внутренностями» [1, с. 71]. Але ўздрыгвае ад страху, калі «крупный рыжий муравей вынырнул из волос мечтателя, пробежал по его виску и пополз через глаз. И веко лежащего не дрогнуло, и по-прежнему широко были раскрыты его глаза» [1, с. 71].

Вестка пра смерць каханага на фронце прыйшла да Надзенькі ў час святкавання яе народзінаў («Именинница»). Трагічнае паведамленне блізкія старанна хаваюць ад дзяўчыны: «И весь вечер мы смеялись, хохотали и дурили как никогда. И поддаваясь нашей веселости, смеялась и Наденька» [1, с. 74]. Раней думалася: ці апраўдана такая бяздушнасць у адносінах да памяці загінуўшага сябра? Сёння час прыўнёс змены ў правілы паводзін, знешнія праявы чалавечых адносін, абыходжанне з акружаючымі. На пачатку ХХ ст. этыкет у зносінах з людзьмі вітаў эмацыянальную стрыманасць, адпаведнасць паводзін чалавека поўным канонам. Каштоўнасцю для гасцей імянінніцы стала захаванне душэўнага спакою дзяўчыны, надзея на вяртанне пасля вайны каханага. Вайна – зло, бо яна перакрэслівае магчымасць сямейнага шчасця Жоржа і Надзенькі, забірае жыццё маладога хлопца. Складнікам філасофіі шчасця ў ваенны час з'яўляецца само жыццё.

У казцы-прытчы «Башня мира» дойліды спрабуюць пабудаваць вежу як узор дасканаласці, гармоніі, прыгажосці. Спрабуюць, але не могуць, бо адсутнічаюць дойліды з чыстымі рукамі. Жорсткі цар, жадаючы дагадзіць царэўне, загадаў прынесці ўсіх нявінных немаўлят, каб яны будавалі вежу. Але вышэйшыя сілы ўратавалі царэўну і дзяцей, забраўшы іх на неба. Дзеці ў мастацкай спадчыне М. Багдановіча («Чудо маленького Петрика», «Колька», «Марына», «Несчастный случай») – абсалютнае дабро, на іх баку праўда, краса жыцця, ісціна. Яны – васількі ў жыце.

Скразная думка ў творчасці М. Багдановіча: народ, які не надае належнай увагі духоўным каштоўнасцям, страчвае «жывую душу» як надзею на будучыню.

**Літаратура**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 1993.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ